его коммуникативное содержание, так и внутренняя семантическая структура. Столь же многозначна цель произносимого: это и буквальная – прямая цель, запечатленная в самом тексте и представленная самой вербальной формой (ею могут быть благопожелание, проклятие и т.д.), и внутриобрядовая цель (таковой может быть получение вознаграждения за исполнение песни, рацеи), и более отдаленные предписания, связанные с обеспечением урожая, приплодом скота, оберегом от злых сил. Целью может являться также некая высшая задача, связанная с сохранением всеобщего благополучия, мирового порядка [17, с.1-3]. Рацеи отдельных «канапелек», как и сами вербальные и музыкальные тексты волочебных песен, имеют характер магических констатаций, утверждений непременности свершения всего того, о чем поется.

**Список литературы:**


1. Байбурин, А. Тоска и страх в контексте похоронной обрядности (к ритуально-мифологическому подтексту одного сюжета) / А. Байбурин // Труды факультета этнологии. – СПб.: СПбГУ, 2001. – С.105 ; Он же. – Ритуал: свое и чужое // Фольклор и этнография. Проблемы реконструкции фактов в традиционной культуре. – Л. : Наука, 1990. – С. 102 – 110.
2. Березкин, Ю. Ареальное распределение мотивов в мифологиях Америки и северо-восточной Азии / Ю. Березкин // Труды факультета этнологии. – СПб.: СПбГУ, 2001. – Вып. 1.
3. Валачобныя песні / склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей ; склад. муз. част. В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560с. : нот. ил.
4. Варфаламеева, Т. Песні Беларускага Панямоння / Т. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 287 с.
5. Васильева, Е. Напевы русской эпической традиции Прионежья / Е. Васильева // Русский Север. Проблемы этнографии и фольклора. – Л. : Мысль,1982. – 320 с.
6. Веселовский, А. Историческая поэтика / А. Веселовский. – М. : Высш. шк.,1989. – 648 с.
7. Зімовыя песні / уклад., сістэм. тэкст., уступ. арт. і камент. А. І. Гурскага ; уклад., сістэм., характарыст. і рэдагаван. напеваў З. Я. Мажэйкі. – Мінск,1975. – 460с. : нот. ил.
8. Левкиевская, Е. Славянский оберег. Семантика и структура / Е. Левкиевская. – М. : Амфора, 2002. – 320 с.
9. Лучицкая, С. Концепция image в средневековой культуре и средневековом изображении / С. Лучицкая // Антропология культуры. – М. : Икопресс, 2004. – с. 82 – 140.
10. Лысенко, О. Ритуалы аграрного цикла в белорусской этнокультурной традиции Х1Х – ХХ вв. (структура, функция, семантика) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 09.00.01. – СПб. : СПбГУ, 2002. – 22 с.
11. Лысенко, О. Структурные характеристики ритуальных предметов / О. Лысенко, А. Островский // Этносемиотика ритуальных предметов. – СПб.: Наука, 1993.
12. Мажэйка, З. Песні Беларускага Падняпроўя / З. Мажэйка, Т. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 392 с.
13. Мациевский, И. О дифференцированности морфологических доминант в традиционной культуре / И. Мациевский // Искусство устной традиции. Историческая морфология. К 60-летию И.И.Земцовского : зб. статей. – СПб.: РИИИ , 2002. – С. 320 – 342.
14. Неоліт Волині. – Луцьк : Де Марк, 1994. – Ч.1. – 119 с.
15. Тавлай, Г. Белорусские крестинные напевы (опыт гомологической типологизации) / Г. Тавлай // Искусство устной традиции. Историческая морфология. К 60-летию И.И.Земцовского : зб. статей. – СПб.: РИИИ, 2002. – С. 343 – 360.
16. Тернер, В. Символ и ритуал / В. Тернер ; сост. и авт. пред. В. Бейлис, отв. ред. Е. Мелетинский. – М. : Наука,1983. – 277 с.
17. Толстая, С. К прагматической интерпретации обрядового фольклора : рукопись. – 82 л.
18. Толстой, Н. Вербальный текст как ключ к семантике обряда / Н. Толстой // Структура текста : сб. ст. – М. : Наука, 1981. – 230 с.
19. Чюрлионите, Я. Литовское народное песенное творчество / Я. Чюрлионите. – Мінск; Л. : Искусство, 1966. – 320 с.
20. Astrauskas, R. The Lithuanian Calendar Rites and Music: on Issue of Cycle Unity / R. Astrauskas // Ritual and Musik. – Vilnius : Vaga, 1999. – 342 p.
21. Bartsch, Christian. Dainu Balsai. Melodien litauisher Volkslieder / Christian Bartsch. – Helidelberg : Bd. 1, 1886. – 342 p.
22. Darbo dainos. – Vilnius : Vaga, 1993. – 324 p.
23. Dawkins, R. The Selfish Gene / R. Dawkins. – New York; London : Oxford Univ. Press, 1976. – P. 203 – 215.
24. Drabecka, M. Folklor Warmii i Mazur / M.Drabecka, B. Krzyżaniak, J.Lisakowski. – Warszawa : COMUK, 1978. – 583.
25. Wisłański, T. The Globular Amphorae Culture / T. Wisłański // The Neolithic of Poland. – Wroclaw : PAN, 1970. P. – 178 – 231.



***Наталля Петухова***


**РЭКАНСТРУКЦЫЯ СПЕЎНАЙ ЭТНАФОНІІ Ў АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАХ**


*У артыкуле разглядаюцца пытанні рэканструкцыі мясцовых і рэгіянальных народна-песенных традыцый у практыцы фальклорных калектываў. Асаблівая ўвага надаецца характарыстыцы аспектаў існавання фальклору, якія варта разглядаць у працэсе навучання народным спевам.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Natalia Petukhova*

**RECONSTRUCTION OF THE ETHNOPHONOLOGICAL SINGING IN AMATEUR GROUPS**

*The article deals with the development of local and regional folk-song traditions in the practice of contemporary folk groups. Particular attention is paid in order to characterise aspects of the folklore existence that should be considered in the process of learning to sing folk songs.*

Дзейнасць аматарскіх фальклорных калектываў – гэта складаная цэласная сістэма, накіраваная на далучэнне, засваенне, спасціжэнне і аднаўленне фальклорнай спадчыны і фарміраванне на гэтай падставе светаўспрымання і светапогляду асобы. Яна даволі грунтоўна даследавана Т.І. Бакланавай [1], Е.В. Веліканавай [2], А.Ю. Любамудравай [3], Л.Л. Ражковай [5] і іншымі даследчыкамі, якія, у сваю чаргу, вызначаюць яго асноўныя напрамкі: пазнавальны, канцэртна-выканальніцкі, рэкрэацыйна-асветніцкі.

Пазнавальны напрамак дзейнасці фальклорных калектываў прадугледжвае: знаёмства аматараў з асаблівасцямі матэрыяльнай і духоўнай традыцыйнай культуры беларускага народа; вывучэнне традыцыйнай народна-песеннай творчасці Беларусі, яе рэгіянальных асаблівасцей, засваенне іншых жанраў народнай творчасці – прыказак, прымавак, легенд, паданняў, казак; авалоданне навыкамі народнай манеры спеваў; знаёмства з танцавальна-гульнёвым і музычна-інструментальным фальклорам.

Канцэртна-выканальніцкі напрамак адлюстроўвае актыўны ўдзел аматараў у канцэртах і конкурсах, фестывалях, шэсцях і масавых святах, падчас якіх яны могуць прадэманстраваць адмысловую і самабытную фальклорную спадчыну.

Рэкрэацыйна-асветніцкі напрамак мае на мэце наведванне ўдзельнікамі фальклорных калектываў экскурсій, выставак народнай творчасці, удзел у фальклорных экспедыцыях.

Трэба адзначыць, што вызначаныя напрамкі ўяўляюць сабой тры паслядоўныя этапы, заснаваныя на логіцы руху ад пазнання міфалагічнай і эстэтычнай сутнасці фальклору, якое прадугледжвае назапашванне пэўнай сукупнасці ведаў аб дадзеным культурным феномене, да іх актуалізацыі і рэканструкцыі ў канцэртна-выканальніцкай і рэкрэацыйна-асветніцкай дзейнасці.

Зыходнымі пазнавальнага напрамку з’яўляецца праслухоўванне, аналіз і развучванне этнафанічных узораў. Гэта патрабуе глыбокага засваення зместу фальклорнага твора, расшыфроўкі і тлумачэння незразумелых удзельнікам аматарскага калектыву дыялектных слоў, словазлучэнняў, засваення ладава-інтанацыйнай і метрарытмічнай будовы музычнай мовы, мнагапланавага і асацыятыўнага зместу паэтычных формул, якія адлюстроўваюць эмацыянальна-вобразны змест беларускай народнай песні, дапамагаюць адчуць цэласнасць, глыбіню і гармонію мастацкіх твораў фальклору.

Аднак эмацыянальны вобраз народнай песні ствараецца не толькі словам і музыкай, але і ўсім аблічам яе выканаўцы, тэмбрам яго голасу, манерай спеваў. Таму вылучаюцца спецыяльныя заняткі, на якіх народная песня засвойваецца як феномен вуснай традыцыі шляхам шматразовага праслухоўвання этнаграфічных запісаў і самастойнага аднаўлення песні ў адпаведнасці з фальклорным узорам, на падставе еднасці моўных (дыялектных асаблівасцей, спосабаў гукаўтварэння і артыкуляцыі) і музычных (метрарытмічных і ладава-інтанацыйных) характарыстык. Па-першае, варта дамагацца абсалютнай дакладнасці вымаўлення дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйна базай для ўзнікнення меладычнага багацця беларускай песеннасці. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме, з уласцівай яму інтанацыяй, становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцыі. Пры гэтым базай для максімальна дакладнага прайгравання фанетычных асаблівасцей з’яўляюцца казкі, скорагаворкі, лічылкі, дражнілкі і інш.

Па-другое, важна вывучаць музычна-стылявыя заканамернасці, уласцівыя пэўнаму рэгіёну. Рэгіянальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гука, ладавыя асаблівасці, полірытмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда і інш.), асаблівасці харэаграфіі і г.д. Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў розных вёсках, могуць даць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым кожны варыянт захоўвае сваю каштоўнасць і ўнікальнасць. Праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед удзельнікаў фальклорных калектываў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго на практыцы. Спалучаючы шматразовае слуханне этнаграфічнага выканання народнай песні са спробамі ўласнага капіравання, выканаўцы захоўваюць моўныя інтанацыі, інтуітыўна шукаюць свае варыянты ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, жыццёвым кантэкстам. Такі спосаб навучання народным спевам садзейнічае далучэнню асобы да творчасці на аснове мясцовых традыцый, пашырае іх уяўленні аб народнай музычна-паэтычнай мове, дазваляе ім адчуць і ўвасобіць у сваім выкананні атмасферу бытавання фальклору, што спрыяе найбольшаму іх пагружэнню ў фальклорную культуру, узбагачае эмацыянальны свет, выхоўвае любоў да роднага краю.

Асноўная задача канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў фальклорных калектываў – выхаваць пачуццё радасці, асалоды ад мастацкай працы, творчай актыўнасці і ўпэўненасці ў сваіх сілах. Выкарыстоўваючы разнастайныя формы трансляцыі адмысловай і самабытнай фальклорнай традыцыі – скарбу нацыянальнай культуры, аматарскія фальклорныя калектывы набываюць неабходны для ўдасканалення выканальніцкага майстэрства сцэнічны вопыт, што садзейнічае павышэнню інтарэсу асобы да ўспрымання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэканструкцыі твораў фальклору. Удзел у канцэртах і конкурсах, фестывалях і масавых святах значна пашырае кругагляд ўдзельнікаў і прыводзіць да выпрацоўкі ўласных меркаванняў праз параўнанне вынікаў сваёй дзейнасці з вынікамі работы іншых калектываў.

Увогуле, выканальніцтва варта разглядаць як неабходную частку жыцця народнай песні, якая ўяўляе сабой бесперапынны працэс – ад аднаго выканання да наступнага. Менавіта ў момант выканання прыводзіцца ў дзеянне сам механізм традыцыйнасці: «выкананне – ўспрыманне – усведамленне – новае выкананне» і г. д. Пры гэтым, этнафанічныя ўзоры, захоўваючы свае ўстойлівыя канструктыўныя і змястоўныя элементы, аказваюцца, тым не менш, не застылымі раз і назаўсёды «выкапнямі», а рухомымі, здольнымі да развіцця і напаўнення з кожнага новага выканання.

Надзвычай важна ўлічваць у рабоце фальклорнага калектыву варыятыўнасць выканання народнай песні, якая прадстаўляе сабой форму функцыянавання фальклорных узораў, іх імправізацыйнае пераўтварэнне, абумоўленае арыентацыяй на традыцыйны ўзор. Народныя майстры спеваў кожны раз наноў выбудоўваюць музычную тканіну на аснове яго асноўнага напеву. Саліст-выканаўца можа дэманстраваць мноства розных варыянтаў асноўнага меладычнага контуру. У ансамблі галасы народных спевакоў свабодна пераплятаюцца паміж сабой, утвараючы кожны раз новае спалучэнне. Дзякуючы гэтаму, гучанне народнай песні пастаянна ўзбагачаецца, і гэтым яе выкананне носьбітамі традыцыі выгадна адрозніваецца ад завучаных па партыях спеваў, якія практыкуюцца ў многіх аматарскіх і прафесійных фальклорных калектывах.

Вывучэнне і аднаўленне народна-песенных традыцый немагчымае без усведамлення асаблівасцей бытавання фальклорных твораў у тым ці іншым этнаграфічным кантэксце. Само ўзнікненне народных песень адбывалася ў сувязі з пэўнай абрадавай ці побытавай практыкай. Яны суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека, важнейшыя падзеі яго жыцця: нараджэнне, шлюб, смерць, дапамагалі ў выхаванні дзяцей, транслюючы новым пакаленням жыццёвую мудрасць, веды і вопыт. Інакш кажучы, былі непарыўна звязаныя з традыцыйным кантэкстам, існавалі ў замацаваных мясцовымі традыцыямі сітуацыях. Асабліва гэта тычыцца выканання абрадавых твораў.

У выкананні аматарскага калектыву абрадавая песня можа прагучаць больш або менш натуральна падчас рэканструкцыі абрадавай сітуацыі. Мэтазгодна выкарыстоўваць такія святы каляндарнага цыклу, як Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'я, Троіца, Купалле, Жніво, якія могуць набыць характар ўсеагульнага народнага гуляння. Так адбываецца паглыбленне ўдзельнікаў калектыву ў сферу абраду, а іх выкананне атрымлівае эмацыянальную афарбоўку, што забяспечвае неабходны характар гучання. Вясну «гукаюць спеўнымі купкамі «з гары на гару»; з велікоднымі і юраўскімі абыходнымі крокамі крочаць ад хаты да хаты; купальскія спяваюць уначы і па прызначэнні (як вянкі завіваюць, як абыходзяць жыта, як запальваюць вогнішча і водзяць карагоды, гуляюць і дражняцца адзін аднаго, як раніцай сустракаюць сонца)» [4, с. 106]. Шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульняў, танцаў і інш. разлічаны на свабоднае далучэнне ўсіх жадаючых, што дазваляе лёгка стварыць незабыўную атмасферу народнай эстэтыкі. Для саміх удзельнікаў фальклорнага калектыву гэта прадастаўляе выключную магчымасць уключыцца ў абрадавую сітуацыю, перажыць яе, адчуць сябе не толькі пераемнікам, але і носьбітам народна-песенных традыцый.

Вялікае значэнне для дакладнай рэканструкцыі спеўнай этнафоніі мае экспедыцыйная праца (рэкрэацыйна-асветніцкі напрамак дзейнасці аматарскіх калектываў), знаёмства ўдзельнікаў фальклорных калектываў з творчасцю аўтэнтычных выканаўцаў твораў народнага мастацтва (песень, танцаў, казак, карагодаў, інструментальнай музыкі). Як даўно вядома, паўнавартаснае эмацыянальнае ўздзеянне фальклорны твор аказвае толькі падчас яго «жывога» аўтэнтычнага выканання і непасрэднага ўспрымання ад носьбітаў. Незвычайная прыгажосць фальклорных твораў, узмоцненая натуральнасцю трансляцыі, усведамленне сваёй роднасці з тымі, хто некалі жыў і выконваў гэтыя творы, аказвае незабыўнае ўражанне на асобу, адкрывае новыя эмоцыі, асацыяцыі, гарманічныя структуры, драматургічныя камбінацыі і г.д. Непасрэднае ўспрыманне ўдзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў «жывога» выканання паглыбляе іх жыццёвы і эстэтычны вопыт, садзейнічае павышэнню інтарэсу да ўспрымання і рэканструкцыі фальклорных твораў і ўдасканаленню выканальніцкага майстэрства, а непасрэдныя стасункі з носьбітамі фальклору ўзбагачае жыццё калектываў, спрыяе выхаванню павагі да людзей, якія жывуць побач, абуджае жаданне берагчы і працягваць мастацкія традыцыі Беларусі.

**Спіс літаратуры:**


1. Бакланова, Т. И. Теоретические основы педагогического руководства художественной самодеятельностью : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.05 / Т. И. Бакланова ; Ленинград. гос. ин-т культуры. – Л., 1991. – 43 с.
2. Великанова, Е. В. Самодеятельное художественное творчество как основа возрождения национальных культурных традиций : дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / Е. В. Великанова. – Тамбов, 1999. – 239 с.
3. Любомудрова, А. Ю. Развитие музыкальной культуры личности на основе региональных традиций вокально-хорового творчества : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.05 / А. Ю. Любомудрова. – Тамбов, 2000. – 182 с.
4. Ражкова, Л. Л. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.05 / Л. Л. Ражкова ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2007. – 145 с.
5. Пладунова, Т. А. Этнафанія стылі выканання і вакальная практыка ў аматарскім фальклорным калектыве / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання : матэр. III Рэсп. навук.-практ. канф. (г.п. Акцябрскі, 19–20 крас. 2006 г.) / аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мінск. : БелДІПК, 2006. – Вып. 2. – С. 101 – 108.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ